# З Баку гаворыць Скарына…



**Сёння, 23 верасня, у Мінску ў кнігарні "Светач" а 12-й гадзіне пачнецца прэзентацыя мініяцюрнага выдання "Кнігі Юдзіфі", якое пабачыла свет у Баку.**

Гэты выдавецкі праект з'явіўся на свет дзякуючы ініцыятыве стваральніцы і кіраўніка прыватнага Музея мініяцюрнай кнігі ў горадзе Баку Зарыфе Салахавай. Кніга выйшла ў свет у выдавецтве "Indigo print house" у серыі "Кніжная спадчына Францыска Скарыны". Удзел у ажыццяўленні праекта прынялі Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Кангрэс азербайджанскіх абшчын Рэспублікі Беларусь. Прадмову да кнігі напісалі намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша і загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Галіна Кірэева. Пераклад на сучасную беларускую і рускую мову належыць Алесю Бразгунову. На англійскую – Ганне Каваленка.

Удзел у прэзентацыі прыме і спадарыня Зарыфа Салахава. Некалькі слоў пра яе. Зарыфа Салахава – заслужаны работнік культуры Азербайджана, член Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА пры Прэзідэнце Азербайджанскай Рэспублікі, прафесар па правах чалавека Інстытута Нацыянальнай акадэміі навук, актыўны сябра таварыства дружбы і супрацоўніцтва "Азербайджан – Беларусь". Музей мініяцюрнай кнігі адкрыты для наведвальнікаў з 2002 года – у гістарычнай частцы Баку. У ім экспануюцца тысячы мініяцюрных кніг, якія надрукаваны ў 62 краінах свету. Асабіста спадарыня Зарыфа Салахава з'яўляецца выдаўцом болей як 100 мініяцюрных кніг.

Удзеу прэзентацыі возьмуць беларускія кнігавыдаўцы, бібліятэказнаўцы, пісьменнікі Аляксей Чарота, Алесь Суша, Таццяна Сівец, Навум Гальпяровіч і шмат хто яшчэ.

**Алесь Карлюкевіч**

**Фота: Зарифа Салахова, indigo.az**